УДК (070 + 94) (476) “15/16”

# “СЛАВУТЫ ЎЕЗД У РЫМ ЕЖЫ АСАЛІНСКАГА”: ДАКУМЕНТЫ ДРУГОЙ ЧВЭРЦІ XVII ст.

**В. І. Еўмянькоў**
(Установа адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”,
кафедра літаратуры і міжкультурных камунікацый)

*У артыкуле прааналізаваныя неперыядычныя выданні XVII ст., а таксама дыярыуш пасла Рэчы Паспалітай у Ватыкане Ежы Асалінскага.*

Спачатку звернемся да дакумента з назваю “Славуты ўезд у Рым Яснавяльможнага пана, яго міласці пана Ежы Асалінскага, вялікага пасла польскага...”[1]. Як пазначана на тытуле, тэкст улёткі – пераклад з італьянскай мовы на польскую. Дата друку таксама падаецца на тытуле: “de data 3. Decemb. 1633”.

Дакумент распавядае пра адну з самых таемных, “па-за чарговых”, місій, здзейсненых будучым каронным канцлерам Ежы Асалінскім. Аўтар жыццяпіса канцлера Францішак Багамолец адносна гэтай місіі піша: “<…> меў ён [Асалінскі. – *В. Е.*] нейкія сакрэтныя даручэнні ад караля, сутнасць якіх была ў заключэнні пэўнай дамовы са сталіцай апостальскай” [1, с. 133]. Хоць, праўда, былі і фармальныя прычыны для пасольства: па-першае, трэба было паведаміць пра тое, што на пасад Рэчы Паспалітай узышоў новы кароль Уладзіслаў IV; па-другое, трэба было неяк улагодзіць судовую спрэчку, якую ў Рыме распачалі езуіты з Кракаўскай акадэміяй. З апошняй задачай Асалінскі справіўся бліскуча: паабяцаў езуітам фундаваць новы калегіум у Быдгошчы і сваё абяцанне, калі верыць Ф. Багамольцу, спраўдзіў.

Была яшчэ адна прычына для пасольства ў Ватыкан. На элекцыйным сейме 1632 г. Рымскі Папа Урбан VIII вуснамі свайго нунцыя Ганорыя Вісконці падтрымаў кандыдатуру каралевіча Уладзіслава, на той час дэкларававанага караля шведскага. Уладзіслаў мусіў пантыфіка аддзячыць.

Адносна таемных дамоў, якія ён меўся заключыць з Ватыканам, улётка нічога пэўнага не паведамляе. Маўчыць і Ф. Багамолец. Праўда, здагадацца тут не так ужо і цяжка… Уладзіслаў IV, хутчэй за ўсё, мусіў прасіць падтрымкі ў еўрапейскіх уладароў супраць Атаманскай Порты, якая якраз летам 1633 г. значна актывізавалася на Падоллі. Аўтарытэт Рымскага Папы Урбана VIII мог бы падштурхнуць каталіцкія краіны да сумеснага супрацьстаяння турэцкай экспансіі. Магчыма, гутарка вялася пра працяг палітыкі Жыгімонта III у адносінах да Масквы, войскі якой таксама значна актывізаваліся якраз напярэдадні элекцыйнага сейма 1632 г. Была, праўда, яшчэ адна прычына выправы Ежы Асалінскага, пра якую згадвае польскі гісторык Каятан Квяткоўскі. На каранацыйным сейме 1633 г. уніяты прасілі хадайнічаць перад Рымскім Папам “аб пацвярджэнні вольнасці іх веры”.

Зразумела таксама і тое, чаму пасольства Рэчы Паспалітай узначаліў менавіта Ежы Асалінскі. Ён быў адзіным амбасадарам, якому ўдалося дамагчыся падтрымкі ў еўрапейскага ўладара напярэдадні Хоцімскай

[1] SŁAWNY WIAZD DO RZYMV, Iasnie Wielmoznego Pana, IE. M. P. IERZEGO OSSOLINSKIEGO WIELKIEGO POSŁA POLSKIEGO, z Włoskiego na Polskie przetłumaczony, de data 3. Decemb. 1633.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вайны (у студзені 1621 г. ён здзейсніў удалае падарожжа ў Англію). Але вернемся да ўлёткі… Звернем увагу на тое, што змест дакумента дзіўным чынам нагадвае як змест Дыярыуша пасольства (аўтар – хутчэй за ўсё сакратар пасольства Анджэй Гэмбіцкі), так і змест Дыярыуша самога Ежы Асалінскага, на які часта спасылаецца Ф. Багамолец. Праўда, у адрозненне ад Ф. Багамольца, аўтар улёткі абмінае некалькі важных момантаў, звязаных з пачаткам падарожжа Асалінскага і пачынае аповед непасрэдна з уезду пасольства Рэчы Паспалітай у Рым. Гэта значыць, што падзеі, якія пачынаюцца з 23 верасня (выезд з Кракава) і завяршаюцца 27 лістапада (афіцыйны ўезд пасольства ў Рым), застаюцца па-за ўвагай чытача.

А паміж іншым, напярэдадні 27 лістапада адбыліся здарэнні, вартыя ўвагі калі і не гісторыка, то байкапісца. Перадусім апісанне гэтых здарэнняў шмат у чым характарызуе тую палітычную сітуацыю, якая панавала ў тагачаснай Еўропе. Ф. Багамолец са спасылкай на Дыярыўш пасольства гэтак апісвае цырымонію неафіцыйнага ўезду ў Рым Ежы Асалінскага і тых замежных амбасадараў, якія вырашылі прывітаць калегу ў прадмесцях апостальскай сталіцы:

“Калі рушылі да рымскіх муроў, выбухнуў немалы гвалт паміж уладальнікамі прыбываючых карэт. Спрачаліся яны за першынства ўезду ў горад. Найбольшая калатнеча адбылася паміж стангрэтамі [вазніцамі. – *В. Е.*] паслоў іспанскага і французскага. Імкнуліся яны з вялікім імпэтам адзін аднаго на шляху да гарадской брамы апярэдзіць. І абодва ў браму, завузкаю для такіх шырокіх карэт, уехалі – ды так няўдала, што выехаць ужо з яе не маглі. Дайшло б напэўна да праліцця крыві, калі б улады рымскія таму не запярэчылі. Іншыя карэты той спрэчкай былі затрыманыя і, не дачакаўшыся яе канца, праз іншую браму ў месца ўехалі.

Тым часам іспанская карэта першай з брамы выслізнула і, нібы вайну выйграла, з вялікім трыумфам вярнулася ў Рым” [1, с. 128].

Гэты ўрывак паказальны таму, што характарызуе ўнутрыпалітычную сітуацыю ў Еўропе як надзвычай складаную. Ежы Асалінскі прапаноўваў еўрапейцам вырашыць праблему турэцкай экспансіі, якая многімі на той час успрымалася як другасная. Магчыма ўсведамленне гэтага і падштурхнула пасла Рэчы Паспалітай да выбару адпаведнай дыпламатычнай тактыкі – прыцягнуць увагу да сваёй краіны і яе патрэб з дапамогай незвычайнага бляску, пыхі і помпы. Вось што паведамляе на гэты конт аўтар улёткі:

“Pacoл extraordinarius каб засведчыць паслушэнства Айцу Святому і ў імя Найяснейшага Уладзіслава IV, караля польскага, здзівіў усіх часткова строямі нябачнымі да таго часу ніколі, часткова багаццем нечуваным”. Уезд пасольства Рэчы Паспалітай пакінуў цень нават на папярэдні ўезд французскага пасла. Аўтар улёткі пра гэта са здзіўленнем паведамляе:

“Наперадзе ехалі два прадстаўнікі яго міласці пана пасла, прыбраныя па-польску – у чырвоных сукнях. Услед за імі рухаліся 22 вазы са скарбам, накрытыя сукном дарагім чырвоным з гербамі паноў са складу пасольства Потым вялі 10 вярблюдаў, якіх упрыгожвалі папоны з чырвонага аксаміту, золатам надзвычай багата вышытыя, абсыпаныя срэбранымі і іншымі дарагімі аздабленнямі”.

Далей цытуем гэты ж самы дакумент, але ўжо ў рэдакцыі Ф. Багамольца (адзначым нязначныя разыходжанні, у параўнанні з дакументам XVII ст.):

“Недалёка ад іх [дваран кардыналаў. – *В. Е.*] ехалі 30 пакаёвых пана пасла на выдатных конях са срэбранай збруяй, усе апранутыя ў яркія аксамітныя польскія кунтушы блакітнага колеру. Мелі яны пры сабе сагайдакі срэбрам”.

Падобны ўезд, відавочна, мусіў прыцягнуць увагу не толькі жыхароў Рыма, але і палітычнага істэблішменту, які канцэнтраваўся вакол Ватыкана. Да месца тут працытаваць яшчэ раз Ф. Багамольца: “Не толькі рымляне, але і чужаземцы прызнаваліся, што ніколі ў жыцці такога прыўкраснага ўезду не бачылі” [1, с. 132]. Аўтар улёткі да гэтага дадае: “Усе дарогі, усе вуліцы, праз якія рухалася пасольства, былі загачаныя карэтамі і надзвычай вялікай колькасцю людзей – так, што цяжка было прасунуцца наперад. Слава народу польскага і яго міласці пасла былі вялікія…”. Аднак, ці атрымаў Ежы Асалінскі, а з ім разам і Уладзіслаў IV тое, што хацеў?

Улётка на гэты конт ніякай інфармацыі не змяшчае, а вось Ф. Багамолец згадвае пра аўдыенцыю Ежы Асалінскага ў Рымскага Папы, якая адбылася 6 снежня. Праўда, згадка гэта таксама не інфармацыйная. Ф. Багамолец паведамляе пра пекную арацыю, якая зляцела з вуснаў Асалінскага і “<…> яшчэ больш уразіла прысутных” [1, с. 134]. Была і другая аўдыенцыя напярэдадні выезду Асалінскага з Рыму (23 снежня). Яна прынесла паслу Рэчы Паспалітай пазітыўны вынік – ён атрымаў тытул князя, а яго спадчынны маёнтак статус княства. І на гэтым звесткі пра вынікі пасольства завяршаюцца. Як трэба думаць, і Ватыкан, і еўрапейскія палітыкі толькі дэкларавалі сваю падтрымку Рэчы Паспалітай. Ніякіх рэальных крокаў здзейсніць яны не планавалі.

**Літаратура**

1. Bohomolec, Fr. Życie Jerzego Ossolińskiego, kanclerza wielkiego koronnego / Fr. Bohomolec. – W Krakowie : nakładem drukarni “Czasu”, 1860. – 351 s.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова